ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 2 (489) | Субота, 16 студзеня 1982 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

**Аб узнагароджанні Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР**

За поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і вялікі ўклад у развіццё навукі і культуры ўзнагародзіць Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэт імя У. І. Леніна Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. ПАЛЯКОЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. ЧАГІНА.**

13 студзеня 1982 года. г. Мінск.

## КАЛЕКТЫВУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

Дарагія таварышы!

Калектыў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта горача і сардэчна віншуе вучоных, выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў, усіх супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна са знамянальным юбілеем — 60-годдзем з дня заснавання.

Ваш універсітэт з'яўляецца флагманам вышэйшай школы нашай рэспублікі, адным з буйнейшых навуковых цэнтраў краіны. Ён адыграў значную ролю ў стварэнні і развіцці Акадэміі навук БССР, Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна, шэрагу навукова-даследчых устаноў. Цяпер ён штогод выпускае каля трох тысяч фізікаў, матэматыкаў, хімікаў, біёлагаў, географаў, гісторыкаў, філосафаў, юрыстаў, філолагаў і журналістаў. Усяго за гады свайго існавання універсітэтам падрыхтавана каля 60 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі. Многія былыя выпускнікі універсітэта — гэта выдатныя партыйныя, савецкія і дзяржаўныя дзеячы, пісьменнікі, педагогі, вядомыя вучоныя, якія складаюць гонар айчыннай і сусветнай навукі.

Вы можаце ганарыцца сваімі навукова-педагагічнымі кадрамі. Сярод іх 44 акадэмікі і члены-карэспандэнты Акадэміі навук БССР, звыш ста прафесараў і дактараў навук, каля 800 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Яны перадаюць свае веды амаль 18 тысячам студэнтаў і 1100 аспірантам і спаборнікам, у тым ліку больш 800 прадстаўнікам з 64 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Пры Вашым універсітэце плённа працуюць НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі, НДІ фізіка-хімічных праблем і Інстытут павышэння кваліфікацыі, дзе штогод праходзяць перападрыхтоўку каля 400 выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў краіны.

З выпадку знамянальнай даты шчыра жадаем Вам і надалей заставацца на перадавых рубяжах айчыннай навукі, уносіць дастойны ўклад у справу камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

**Рэктар Гомельскага дзяржуніверсітэта акадэмік АН БССР Б. В. БОКУЦЬ**
**Сакратар парткома М. І. СТАРАВОЙТАЎ**
Старшыня мясцкома **М. Н. МУРАШКА**
**Сакратар камітэта ЛКСМБ С. В. АЎСЕЕНКА**
**Старшыня прафкома Н. І. КОЛТЫШАВА**

### Дзённік сесіі



# ЧАРГОВАЕ ВЫПРАБАВАННЕ— НА «ВЫДАТНА»!

Ва універсітэце ідзе зімовая экзаменацыйная сесія. Для каго — яна першая ў студэнцкім жыцці, для іншых — ужо знаёмае выпрабаванне. У нас, студэнтаў групы Г-41 гісторыка- філалагічнага факультэта, гэта ўжо сёмая па ліку сесія. Толькі выдатныя і добрыя адзнакі атрымлівалі нашы рабяты ў час экзаменаў, у папярэднія гады не было ў нас і запазычанасцей. Таму не выпадкова наша група лічыцца адной з лепшых на факультэце і ва універсітэце.

Не здаем мы сваіх высокіх пазіцый і ў бягучую сесію. 11-га студзеня на першым экзамене па педагогіцы, як заўсёды, наперадзе былі тыя, хто сістэматычна рыхтаваўся да практычных і семінарных заняткаў, актыўна ўдзельнічаў у грамадскай рабоце: Валянціна Дзергачова, Валерый Галко, Леанід Цвыраў і іншыя, веды якіх былі ацэнены вышэйшым балам.

Глыбокім і змястоўным быў адказ на экзамене Валерыя Галко (на здымку). Ён усебакова раскрыў змест прамовы У. І. Леніна на III з'ездзе камсамола і яе метадалагічнае значэнне для выхавання падрастаючага пакалення. Святлана Румянцава на канкрэтным матэрыяле паказала асаблівасці правядзення тэматычных і аглядных палітінфармацый у школе, а таксама методыку арганізацыі праверкі і ацэнкі ведаў вучняў.

Немалаважнае значэнне ў паспяховай здачы экзамена па педагогіцы мелі практычныя заняткі, на якіх студэнты праяўлялі высокую пазнавальную актыўнасць. Асабліва вялікая роля калёквіумаў, якія праводзіліся па асноўных раздзелах педагогікі.

Напярэдадні экзамена была праведзена кансультацыя, на якой студэнты разам з кандыдатам педагагічных навук, дацэнтам Ф. У. Кадолам абмеркавалі пытанні, якія выклікалі пры падрыхтоўцы да экзамена найбольшыя цяжкасці.

Усё гэта і забяспечыла поспех у здачы першага ў гэту сесію экзамена. Хочацца пажадаць усім студэнтам універсітэта паспяхова вытрымаць выпрабаванні на веды, традыцыйнага студэнцкага «Ні пуху, ні пер'я!»

**Рыгор СТРЫЖАК, староста групы Г-41 гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**Фота У. Чысціка.**

*Роздум пасля экзамена*

## «ВЕДЫ»... У СМЕЦЦІ

Тое, што ва універсітэце паўнаўладнай гаспадыняй стала «яе вялікасць» экзаменацыйная сесія», бачна адразу. Цяжка знайсці свабоднае месца ў чытальнай зале, раніцай у калідорах карпусоў, каля дзвярэй аўдыторый, дзе выкладчыкі прымаюць экзамены,— гаманлівыя натоўпы студэнтаў з падручнікамі, канспектамі ў руках. Заўважаеш напружанне і хваляванне на тварах экзаменуемых, якое спадае толькі тады, калі апошні студэнт пакідае аўдыторыю з заліковай кніжкай, ў якой ацэнены яго веды па прадмету.

Здадзен экзамен, і зноў усталёўваецца цішыня да наступнага выпрабавання. Але якую непрывабную карціну даводзіцца назіраць каля тых аўдыторый, дзе праходзілі экзамены, і ў калідорах: на сталах, на падлозе валяюцца вырваныя з канспектаў і нават падручнікаў лісты з формуламі, цытатамі, паперкі ад цукерак. ...І тут жа «часовыя» веды студэнтаў — так званыя шпаргалкі.

Не будзем катэгарычнымі: не кожны, канешне, студэнт здае экзамен такім вось чынам — з дапамогай шпаргалак. Зразумела, што ідуць на гэта тыя «гора-студэнты», якім ужо не пад сілу з-за шматлікіх пропускаў заняткаў за два-тры дні да пачатку экзамена засвоіць значны аб'ём вучэбнага матэрыялу. Яны без сораму змогуць вырваць і старонкі з падручніка. Дзейнічаюць яны па прынцыпу: «Мэта апраўдвае сродкі».

Так і атрымліваецца, што непрыемна праходзіць пасля чарговага экзамена па калідорах універсітэта, як гэта было, напрыклад, у панядзелак, 11-га студзеня на другім паверсе вучэбнага корпуса № 1. Прыбіральшчыцы работы тут хапіла, каб вымесці так званыя «веды» студэнтаў. Трэба быць больш прынцыповымі і патрабавальнымі да экзаменуемых выкладчыкам. І тады веды будуць заставацца у памяці студэнтаў, а не ў... смецці.

**Т. ДУБЯК.**

# КАФЕДРЫ ЭКАНОМІКІ ПРАЦЫ—10 ГАДОЎ

Дзесяць гадоў таму назад на эканамічным факультэце была створана першая спецыяльная кафедра — эканомікі працы. Першапачаткова на ёй працавалі ўсе выкладчыкі факультэта. Кафедра забяспечвала вучэбны працэс больш чым па 20 дысцыплінах і курсах, большасць з якіх з'яўляліся прафілюючымі.

У канцы 1973 года з кафедры эканомікі працы выдзелілася кафедра галіновых эканомік. Цяпер жа на факультэце функцыяніруе пяць кафедр. На кожнай з іх ёсць супрацоўнікі, якія пачыналі сваю выкладчыцкую дзейнасць на нашай кафедры.

Штогод кафедра эканомікі працы дабіваецца добрых вынікаў. У гэтым вялікая заслуга яе загадчыка прафесара У. Д. Арэшчанкі. Ён умела падбірае і выхоўвае кадры, дамагаецца няўхільнага ўдасканальвання іх работы. На кафедры выраслі і паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі А. У. Жук, А. І. Максімовіч, Л. С. Лазучэнкава, Г. К. Балтрушэвіч, В. А. Трухаў і інш.

Разнастайныя навуковыя інтарэсы супрацоўнікаў кафедры забяспечваюць комплексныя даследаванні пытанняў арганізацыі працы на прадпрыемствах рэгіёна. Да навукова-даследчай работы актыўна прыцягваюцца студэнты. Усе выконваемыя на кафедры дыпломныя работы ўтрымліваюць элементы навуковых даследаванняў, што сведчыць аб высокім узроўні падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, іх арыентацыі на вырашэнне праблемных пытанняў практыкі прамысловых прадпрыемстваў. Студэнты - дыпломнікі В. Дзервянкова, І. Касенка, С. Анцічэнка распрацавалі праекты арганізацыі комплексных форм працы для брыгад І. Дзідкоўскага, Н. Радвілса і Н. Назаранкі з Гомельскага завода пускавых рухавікоў, выступіўшых з ініцыятывай аб датэрміновым укараненні на вытворчасці брыгаднага падраду. Гэтым самым быў забяспечаны рост прадукцыйнасці працы на 18—30 працэнтаў.

За дзесяць гадоў эканамічны эфект ад навуковых рэкамендацый кафедры на прадпрыемствах Гомельшчыны перавысіў мільён рублёў. Яе супрацоўнікі актыўна ўдзельнічаюць у прапагандзе эканамічных ведаў на прамысловых прадпрыемствах вобласці. Да свайго юбілею супрацоўнікі кафедры прачыталі звыш 900 лекцый, 174 разы выступалі на навукова-практычных канферэнцыях рознага рангу, апублікавалі 194 навуковыя працы, у тым ліку дапаможнік па эканоміцы працы з грыфам Мінвуза СССР.

Калектыў кафедры эканомікі працы малады і плённа працуе над павышэннем сваёй кваліфікацыі, лектарскага і педагагічнага майстэрства.

Пажадаем жа супрацоўнікам кафедры далейшага росту навукова-педагагічнага патэнцыялу, новых поспехаў ва ўсіх справах.

**А. НЯВЕРАЎ, намеснік дэкана эканамічнага факультэта.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта, кафедра эканомікі працы горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ТРУХАВА Валерыя Анатольевіча з зацвярджэннем яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.**

*XIX з'езду ВЛКСМ, 60-годдзю СССР — дастойную сустрэчу!*

# ДЛЯ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ

## ПАЛАЖЭННЕ АБ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ СБА

Студэнцкія атрады з'яўляюцца эфектыўнай формай камуністычнага выхавання моладзі. У іх рабоце знаходзіць сваё адлюстраванне імкненне студэнцтва актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні практычных задач камуністычнага выхавання.

Усё жыццё і дзейнасць студэнцкіх атрадаў грунтуюцца на прынцыпах маральнага кодэксу будаўнікоў камунізму і Статута ВЛКСМ. Байцы студэнцкіх атрадаў сваёй дзейнасцю, актыўным удзелам у грамадскім жыцці паказваюць узоры арганізацыі працы, самастойнасць у рашэнні пастаўленых задач, калектывізм, высокую свядомасць.

Праца студэнтаў у летні перыяд з'яўляецца працягам вучэбна-выхаваўчага працэсу ў вышэйшай навучальнай установе. Студэнцкія атрады, якія арганізоўваюцца на прынцыпах добраахвотнасці, самакіравання і строгай дысцыпліны, выхоўваюць у студэнтаў пачуццё адказнасці за працу ў калектыве, вучаць падыходзіць да справы з дзяржаўных пазіцый.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж лінейнымі студэнцкімі атрадамі універсітэта накіравана на дастойную сустрэчу XIX з'езда ВЛКСМ, 60-годдзя ўтварэння СССР і паспяховае выкананне задач, якія вынікаюць з рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

### I. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ СПАБОРНІЦТВА

Сацыялістычнае спаборніцтва — важнейшы стымул вытворчай і вучэбнай дзейнасці студэнтаў. Мэта яго — павышаць якасць вучобы, грамадска-палітычную і працоўную актыўнасць юнакоў і дзяўчат.

**Задачы:**

— павышаць якасць вучобы студэнтаў, развіваць творчы падыход да вывучэння ўсіх дысцыплін;

— прыцягваць усіх студэнтаў да актыўнай дзейнасці ў грамадскім жыцці універсітэта;

— выхоўваць усіх студэнтаў на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа;

— ствараць у атрадзе дзелавую, творчую атмасферу узаемадапамогі, камсамольскай дысцыпліны і прынцыповасці;

— якасна фарміраваць студэнцкія атрады і праводзіць на высокім ідэйна-палітычным узроўні трэці працоўны семестр.

### II. ФОРМА ПРАВЯДЗЕННЯ І АРГАНІЗАЦЫЯ СПАБОРНІЦТВА

Сацыялістычнае спаборніцтва праводзіцца ў аглядзе-конкурсе на лепшую камсамольскую арганізацыю універсітэта і лепшы лінейны атрад па рабоце ў падрыхтоўчы і рабочы перыяд. Спаборніцтва праводзіцца паміж факультэтамі на званне «Лепшая камсамольская арганізацыя па падрыхтоўцы працоўнага семестра», а таксама паміж лінейнымі атрадамі на званне «Лепшы студэнцкі атрад».

### III. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ КАМСАМОЛЬСКІМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ ФАКУЛЬТЭТАЎ НА ЗВАННЕ «ЛЕПШАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕННЮ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА»

Падвядзенне вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва праводзіцца па факультэтах. Лепшай лічыцца камсамольская арганізацыя **факультэта, якая** набярэ меншую суму месц па напрамках работы, якая не мае выпадкаў парушэння Статута ВЛКСМ і правілаў тэхнікі бяспекі, а таксама праявіўшая высокую дысцыпліну і творчую ініцыятыву.

Вынікі падводзяцца ў два этапы: першы — падрыхтоўчы перыяд; другі — рабочы перыяд.

Па выніках падрыхтоўчага перыяду лепшая камсамольская арганізацыя ўзнагароджваецца Ганаровай граматай камітэта камсамола ГДУ.

Вынікі першага этапа падводзяцца ў маі 1982 года. Па выніках працоўнага семестра (падрыхтоўчы і рабочы перыяд) лепшай камсамольскай арганізацыі ўручаецца пераходны Чырвоны сцяг універсітэта, яна ўзнагароджваецца Ганаровай граматай рэктарата, парткома, камітэта ЛКСМБ і прафкома.

Вынікі другога этапа падводзяцца ў кастрычніку 1982 года.

#### ЯКАСНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ ПАДРЫХТОЎЧАГА ПЕРЫЯДУ

**Арганізацыйная работа**

1.1. Працэнт студэнтаў, якія прыцягваюцца да ўдзелу ў будаўнічых атрадах да агульнай колькасці не занятых практыкай.

1.2. Працэнт байцоў, якія маюць спецыяльнасці будаўнікоў.

1.3. Сярэдні бал экзаменацыйных адзнак па курсу «Ахова працы ў студэнцкіх будаўнічых атрадах».

1.4. Захоўванне графікаў дагаворнай кампаніі, праходжанне медыцынскага агляду, навучанне па курсу «Ахова працы ў СБА», падача дакументацыі ў штаб працоўных спраў і т. д. (па прадстаўленню штаба працоўных спраў універсітэта).

1.5. Сярэдні бал экзаменацыйных адзнак, атрыманых камандзірамі і камісарамі пры атэстацыі.

**Ідэйна-выхаваўчая работа.**

2.1. Працэнт грамадска-палітычнага актыву студэнцкіх атрадаў, які прайшоў абучэнне, ад агульнай колькасці байцоў.

2.2. Сярэдні працэнт выканання атрадамі сацыялістычных абавязаацельстваў за падрыхтоўчы перыяд па грамадска-палітычнай рабоце.

2.3. Сума месц, занятых у аглядах-конкурсах, якія праводзіліся штабам працоўных спраў універсітэта.

2.4. Наяўнасць новых форм работы.

#### РАБОЧЫ ПЕРЫЯД

**Арганізацыйная работа.**

1.1. Сярэдні бал экзаменацыйных адзнак па выніках летняй сесіі.

1.2. Працэнт выканання планавай колькасці зводнага студэнцкага атрада універсітэта.

1.3. Працэнт выканання дагаворных абавязацельстваў па асваенню капіталаўкладанняў.

1.4. Рэгулярнасць справаздачнасці атрадаў перад штабам працоўных спраў (па прадстаўленню штаба працоўных спраў універсітэта).

1.5. Справаздачнасць атрадаў пасля вяртання (па прадстаўленню штаба працоўных спраў універсітэта).

1.6. Своечасовасць уплаты камсамольскіх і прафсаюзных узносаў.

**Ідэйна-выхаваўчая работа.**

2.1. Сярэдні працэнт выканання атрадамі сацыялістычных абавязацельстваў на рабочы перыяд па грамадска-палітычнай рабоце.

2.2. Наяўнасць усіх форм работы.

### IV. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА СЯРОД СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ НА ЗВАННЕ «ЛЕПШЫ СТУДЭНЦКІ АТРАД»

Лепшым студэнцкім атрадам універсітэта лічыцца атрад, які мае найвышэйшы працэнт выканання сацыялістычных абавязацельстваў на падрыхтоўчы і рабочы перыяд, які паказаў высокую дысцыпліну і творчую ініцыятыву, не мае парушэнняў Статута Усесаюзнага студэнцкага будаўнічага атрада і правілаў тэхнікі бяспекі.

Вынікі падводзяцца ў два этапы: першы — паадрыхтоўчы перыяд, другі — рабочы перыяд.

Па выніках падрыхтоўчага перыяду лепшы студэнцкі атрад універсітэта ўзнагароджваецца Ганаровай граматай камітэта камсамола універсітэта. Студэнцкія атрады, якія зоймуць другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца граматамі камітэта камсамола універсітэта. Вынікі першага этапа падводзяцца ў маі 1982 года.

Па выніках працоўнага семестра (падрыхтоўчы і рабочы перыяды) тром лепшым студэнцкім атрадам ГДУ па напрамках работы (будаўніцтва, меліярацыя, СА небудаўнічага профілю) уручаецца пераходны Чырвоны вымпел камітэта камсамола універсітэта, атрад узнагароджваецца Ганаровай граматай рэктарата, парткома, камітэта ЛКСМБ і прафкома. Фотакарткі атрадаў ля Сцяга універсітэта змяшчаюцца ў альбоме працоўнай славы камітэта камсамола універсітэта. Студэнцкія атрады, якія занялі другія і трэція месцы ў сацыялістычным спаборніцтве, узнагароджваюцца граматамі рэктарата, парткома, камітэта ЛКСМБ і прафкома.

Студэнцкія атрады, якія прызнаны пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва па напрамках работы:

— вытворчая дзейнасць;

— грамадска-палітычная работа;

— ваенна-патрыятычная работа;

— дапамога сельскай школе, узнагароджваюцца граматамі камітэта камсамола ГДУ.

Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва падводзяцца штабам працоўных спраў і зацвярджаюцца камітэтам камсамола універсітэта.

#### САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ НА ПАДРЫХТОЎЧЫ ПЕРЫЯД

Студэнцкі атрад

Факультэт

Камандзір Камісар

| № п/п мерапрыемстваў | Паказчык | Абавязацельствы |
|---|---|---|
| 1. Падрыхтаваць спецыялістаў будаўнічых спецыяльнасцей | чал. | |
| 2. Прыняць удзел у камуністычным суботніку | чал./гадзін | |
| 3. Пералічыць па суботніку | руб. | |
| 4. Прачытаць лекцый | лекцыя | |
| 5. Выступіць з канцэртам | канцэрт | |
| 6. Выпусціць: насценных газет. | шт. | |
| фотагазет | шт. | |
| «маланак» | шт. | |
| 7. Залічыць падлеткаў | чал. | |
| 8. Правесці сустрэчы з ветэранамі вайны і працы | сустрэчы | |
| 9. Правесці паходаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы | паход | |
| 10. Аформіць стэндаў | шт. | |
| 11. Аформіць куткоў па ТБ | шт. | |
| 12. Аформіць куток ганаровага байца. | шт. | |
| 13. Падрыхтаваць грамадска-палітычнага актыву | чал. | |
| 14. Удзел у аперацыі «Мая Радзіма — СССР» | чал. | |
| 15. Закласці алей, названых імёнамі ганаровых байцоў. | алеі | |



**Пяцікурснікаў Віктара Саюшава і Аляксандра Смалярова ведаюць на геалагічным факультэце як студэнтаў, якія добра вучацца, прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Аляксандр — камуніст, добрасумленна адносіцца да ўсіх даручэнняў, Віктар адстойвае спартыўны гонар факультэта.**

**На здымку: В. Саюшаў і А. Смаляроў у час лабараторных заняткаў па мадэляванню гідрагеалагічных працэсаў.**

Фота **У. Чысціка.**

## НА З'ЕЗДЗЕ ГІДРАБІЁЛАГАЎ

У Кіеве адбыўся IV з'езд Усесаюзнага гідрабіялагічнага таварыства. У яго радах налічваецца цяпер 3600 чалавек, яно мае 67 аддзяленняў. На з'ездзе працавала 9 секцый, на якіх было заслухана 470 дакладаў, на пленарных пасяджэннях зроблена шмат цікавых паведамленняў аб біялагічных рэсурсах адкрытых раёнаў Сусветнага акіяна, умовах іх фарміравання, рацыянальным выкарыстанні, асноўных напрамках вывучэння і гаспадарчага выкарыстання біялагічных рэсурсаў унутраных вадаёмаў, актуальных праблемах экалогіі водных жывёл і інш.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел выкладчыкі нашага універсітэта — кандыдат біялагічных навук І. Ф. Расошка і аўтар гэтых радкоў. Прадстаўлены намі даклад «Роля гідрабіёнтаў у працэсах самаачышчэння некаторых вадаёмаў Беларускага Палесся» быў зачытаны на секцыі «Экалагічныя асновы аховы вод». У ім прыводзіліся вынікі шматгадовых назіранняў на рэках Днепр, Сож, Бесядзь, возера Тучным і пяці меліяраваных прытоках названых рэк па колькаснаму развіццю планктона, харчаванню заапланктона і інш. На аснове гэтых матэрыялаў дадзена ацэнка ролі розных груп водных арганізмаў у працэсах самаачышчэння 10 палескіх вадаёмаў.

У рэзалюцыі з'езда значная ўвага была ўдзелена пытанням эканамічнага прагназавання водагаспадарчых комплексаў, рацыянальнаму выкарыстанню біялагічных рэсурсаў адкрытых раёнаў Сусветнага акіяна і ўнутраных вадаёмаў.

**І. АРАБІНА,**
**дацэнт кафедры заалогіі і дарвінізму.**

## ДОБРАЯ ПРАКТЫКА

Ужо не першы год Дружынай па ахове прыроды фарміруецца спецыяльны студэнцкі атрад «Запаведнік». Не стала выключэннем і мінулае лета. На працягу паўтара месяца атрад «Запаведнік-81», у які ўваходзілі шэсць студэнтаў біяфака, працаваў на тэрыторыі Паўночна-Асецінскага дзяржаўнага запаведніка.

Работа ў запаведніку вялася па розных напрамках. Мы праводзілі інвентарызацыю дробных млекакормячых, вялі ўлік тураў, нарыхтоўвалі сена на высокагорных лугах, вывучалі біялогію каўказкага падвіду вавёркі, ахоўвалі тэрыторыю запаведніка.

Не ўсё давалася адразу. Але чым цяжэй было ў першыя дні, тым больш прыемна з цягам часу ўсведамлялася карыснасць нашай працы. Мы чулі шматлікія падзякі ад работнікаў запаведніка.

У запаведніку мы шмат даведаліся новага і карыснага. Яшчэ адзін з цудоўных куткоў нашай Радзімы назаўсёды застанецца ў сэрцы кожнага з нас.

**В. ФІЦНЕР,**
**член атрада «Запаведнік-81».**

